# Класная гадзіна “Я люблю Беларусь”

**Мэта:** выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму сярод вучняў старэйшых класаў
**Задачы:** садзейнічаць развіццю пазнавальных інтэрасаў, цікавасці да гісторыі сваёй краіны;
садзейнічаць выхаванню сапраўдных грамадзян сваёй краіны, патрыётаў Беларусі.
**Абсталяванне**: камп’ютар, карта Беларусі, папяровыя сардэчкі, карткі з заданнямі

**Ход класнай гадзіны**

1. **1. Гучыць песня «Белая Русь» у выкананні Жанет. Адначасова ідзе відэа пра Беларусь**
2. **2. Слова настаўніка:**

— З чым у вас асацыіруецца слова «Беларусь»? *(Адказы вучняў)*

— Чалавек, што жыве на Беларусі, — гэта той, хто… Працягніце, калі ласка, думку.

*(Клас дзеліцца на 2 каманды і выконвае заданні)*
**3.Размінка «Даты ў гісторыі Беларусі»:**
15 сакавіка*(Дзень Канстытуцыі),*
2 красавіка *(Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі)*
9 мая *(Дзень Перамогі),*
3 ліпеня *(Дзень незалежнасці).*
Настаўнік. А якая яна - наша Радзіма?

1. **Конкурс “Ведаю пра сваё”**

1. Імя знакамітага беларускага кнігадрукара з Полацка? *(Францыск Скарына.)*
2. Як завецца асноўны Закон Рэспублікі Беларусь? *(Канстытуцыя.)*
3. Якога полацкага князя ў народных паданнях і летапісах звалі прарочым або чарадзеем? (а) Яраслава; б) Глеба; у) <u>Усяслава;</u> г) Уладзіміра.
4. Як завецца самы старажытны горад Беларусі? (а)Заслаўль; б) <u>Полацак;</u> в) Мінск; г) Гародня.)
5. У Балгарыі гэта Янаў дзень, у Венгрыі - святы Ян, у Іспаніі - Сан-Хуан, у Латвіі - Ліга. А як гэтае свята завецца ў беларусаў? (*Купалле*.)
6. З якой краінай не мае агульнай мяжы Рэспубліка Беларусь? (а)Польшча; б) Расія; у) <u>Германія;</u> г) Украіна
7.Самая доўгая рака ў Беларусі? *(Днепр, 690 км па Беларусі, усяго 2145 км.)*
8. Назавіце колеры Дзяржаўнага Сцяга *(Чырвоны, зялёны, белы.)*
9.Нябесны абаронца зямлі беларускай. (*Евфрасиння Полацкая*)
10.Што завуць беларускім морам? *(Возера Нарач)*

2. **Конкурс “Мастак”**

- На некаторы час я прапаную вам стаць мастакамі. Але маляваць вы будзе не фарбамі, а словамі. Неабходна стварыць карціну пра нашу Радзіму. Кожнае прыгожае слова трэба растлумачыць.

**Сінявокая** - у нас шмат прыгожых рэк, азёр. У палях квітнеюць сінія васількі.
**Зялёная** - вельмі шмат лясоў, лугоў і палёў.
**Лепшая** - таму што - гэта наша Радзіма.
**Дружалюбная** - беларусы - народ дружалюбны і гасцінны.

**Белая** - белы - колер дабра і чысціні. Здаўна беларусы любілі апранацца ў белыя ільняныя кашулі.
**Прыгожая** - у нас прыгожыя гарады, вёскі, вуліцы, пляцы.
**Працавітая** - у Беларусі жывуць працавітыя людзі, якія робяць шмат неабходных рэчаў.
**Лясная** - шмат лясоў, парсюк, пушч.
Цудоўная - у нас цудоўныя вырабы з саломы, гліны, дрэва.
**Майстравая -** у Беларусі вельмі шмат майстроў, якія гафтуюць, плятуць з лазы, малююць.
**Шчодрая** - беларуская зямля вельмі шчодрая. Яна дорыць багаты ўраджай гародніны і садавіны, ягад і грыбоў.
**Талерантная** - у Беларусі жывуць добрыя людзі. Яны паважаюць іншых людзей, лічацца з іх меркаваннем. У іх шмат сяброў.
**Партызанская** - у гады Вялікай Айчыннай вайны ў беларускіх лясах было шмат партызанскіх атрадаў, якія ваявалі за Радзіму

**3.Конкурс "Партрэтная галерэя: знакамітыя людзі Беларусі"**
*(На экране камп'ютара дэманструюцца партрэты знакамітых людзей Беларусі. Дзеці адгадваюць. За кожны правільны адказ - 1 бал)*

Ефрасіння Полацкая, Францыск Скарына, Тадэвуш Касцюшка, Адам Міцкевіч, Марк Шагал, Васіль Быкаў, Жорас Алфёраў, Леў Сапега, Пётр Клімук, Юлія Несцярэнка, Максім Мірны, Вікторыя Азаранка, Дар'я Домрачава, Антон Кушнір, Ала Цупер, Руслан Салей, Анатоль Ярмоленка, Уладзімір Мулявін, Пётр Машэраў, Янка Купала.

**4.Конкурс «Родная мова»**
*(Вучням па чарзе раздаюцца лісточкі са словамі на беларускай мове, неабходна зрабіць іх пераклад на рускую мову. За кожны правільны адказ - 1 бал).*

Ступеньки – прыступкі
Блюдце – сподак
Каблук – абцас
Приветствие – вітанне
Озорник – гарэзнік
Бусы – пацеркі
Заботливый – дбайны
Гордиться – ганарыцца
Осуществить – здзейсніць
Скатерть – абрус (настольніца)
Сковорода –патэльня
Кольцо – пярсцёнак
Копилка – скарбонка
Колодец – студня

***Падвесці вынікі конкурсаў***

- І, колькі ні шукай,
Не знойдзеш ты на ўсёй зямлі

Мілей, чым гэты край.
Не знойдзеш ты такіх людзей,
Іх сэрцы — дабрыня,
Яна струменіць, льецца ў свет
Крынічкаю штодня.
Таму ў жыцці не трэба быць
Няшчырым, сквапным, злым.
Не забывай: ты беларус!
І заставайся ім.

- Галоўны скарб нашай краіны, як і любы іншы, - людзі, а галоўны скарб нашай школы - вучні, асабліва тыя, хто ўсвядомлена прыходзіць сюды за ведамі. Вы ўжо амаль дарослыя, хутка паплывяце ў вялікае плаванне, і вельмі хочацца, каб вы сустрэлі там добрых людзей. Але перш вы і самі павінны стаць добрымі. Што ж для гэтага неабходна? Што неабходна, каб быць сапраўдным чалавекам? Чалавекам з вялікай літары?

-Цяпер я прапаную вам адказаць на гэтае пытанне, выкарыстаючы падказкі *(праца з пазламі ў групе)*.

*Пасля выканання задання рабяты агучваюць запаведзі сапраўднага чалавека.*

1.Рабі дабро
2. Любі і паважай людзей
3. Стаўся да людзей так, як хацеў бы, каб ставіліся да цябе
4. Бойся пакрыўдзіць чалавека
5. Знайдзі сваю мэту ў жыцці
6. Не шукай апраўданні ўласным слабасцям і не лянуйся
7. Спазнавай сябе і мір
8. Не губляй веры ў сябе
9. Лепш аддай сваё, чым вазьмі чужое
10. Умей дарыць радасць людзям

-Давайце ж кіравацца гэтымі запаведзямі і ў адносінах са сваімі аднакласнікамі. І тады я, як класны кіраўнік, як старэйшы таварыш, буду спакойная за вашу будучыню.

-Думаю, наша Айчына ўжо цяпер ганарыцца вашымі поспехамі, і яшчэ больш будзе ганарыцца вамі ў будучыні. Будзьце годнымі грамадзянамі сваёй Радзімы, любіце, абараняйце, зберагайце яе!

**Рэфлексія**

-Прапаную вам зараз аддаць сваё сэрца Радзіме. Прымацоўваючы гэта маленькае сардэчка, прапаную вам выказацца, што неабходна зрабіць, на вашу думку, каб Радзіма квітнела, каб нам было камфортна жыць на гэтым цудоўным кавалку зямлі?

*(вучні прымацоўваюць сардэчкі да карты Беларусі і выказваюцца)*

Ну вось, рабяты, і падышла да канца наша чарговая сустрэча.
І напрыканцы я хачу сказаць вам,
Што Радзіма - гэта другая маці,
Яе не выбіраюць і не губяць,
А проста берагуць і любяць.
Будзем жа сапраўднымі беларусамі!

***(Дэманструецца кліп на песню “Будзьма беларусамі” групы “Ў нескладовае”).***

Ступеньки

Блюдце

Каблук

Приветствие

Озорник

Бусы

Заботливый

Гордиться

Осуществить
Скатерть
Сковорода
Кольцо
Копилка
Колодец

1. Рабі дабро

2. Любі і паважай людзей

3. Стаўся да людзей так, як хацеў бы, каб ставіліся да цябе

4. Бойся пакрыўдзіць чалавека

5. Знайдзі сваю мэту ў жыцці

6. Не шукай апраўданні

ўласным слабасцям і не лянуйся

7. Спазнавай сябе і мір

8. Не губляй веры ў сябе

9. Лепш аддай сваё,

чым вазьмі чужое

10. Умей дарыць

радасць людзям

**Сінявокая** **Зялёная**

**Лепшая** **Цудоўная**

**Дружалюбная** **Майстравая**

**Белая** **Шчодрая**

**Прыгожая** **Талерантная**

**Працавітая** **Партызанская**